*Алена Кастрыца*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ МЕТАДАЎ І ПРЫЁМАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ТЭМЫ «ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР'І»

Той факт, што матэрыял вучэбных заняткаў, прадстаўлены выкладчыкам пры дапамозе інавацыйных метадаў і прыёмаў і, як вынік, атрыманы студэнтамі ў нетрадыцыйнай форме, не толькі забяспечвае вялікую зацікаўленасць і спрыяе высокаму ўзроўню матывацыі да навучальнай дзейнасці, але і больш трывала замацоўваецца ў памяці, не выклікае пярэчанняў. Менавіта таму пры выкладанні студэнтам тэмы «Прыкметы і павер'і», з вызначэннем якіх да нашага часу звязана шмат спрэчных пытанняў, пажадана выкарыстоўваць метады і прыёмы сучасных адукацыйных тэхналогій (інфармацыйнай, крытычнага мыслення, праектнага навучання, кааператыўнага навучання і інш.), якія накіраваны на актывізацыю творчага і разумовага патэнцыялу, на забеспячэнне развіцця і самарэалізацыі асобы студэнта. Прыгадаем некаторыя з метадаў і прыёмаў, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца намі на практычных занятках па курсе «Фалькларыстыка» пры вывучэнні прыкмет і павер'яў.

*Прыём «Ланцужок асацыяцый».*

Студэнтам прапануецца падабраць свае асацыяцыі (яны могуць быць living рознымі: у выглядзе слова, словазлучэння, малюнка, аплікацыі, табліцы і інш.) да паняццяў прыкмета, павер'е і зафіксаваць іх у сшытках, пасля зачытаць услых і, па магчымасці, растлумачыць, чым выклікана тая ці іншая асацыяцыя. Напрыклад:

| | |
|---|---|
| Прыкмета | <u>назіранне,</u> пільнасць, аб'ектыўнасць, пасіўнасць, надвор'е, глядзець, вынік, прычына |
| Павер'е | вера, светапогляд, <u>уяўленне,</u> выдумка, тлумачэнне, засцярога, дзейнічаць |

Пры жаданні рады асацыяцый можна дапоўніць тымі, што ўзніклі ў аднагрупнікаў. Пасля гэтага робіцца выбар: у кожным асацыятыўным радзе падкрэсліваецца найбольш значнае (безумоўна, на думку чалавека, які робіць гэты выбар) слова, словазлучэнне, малюнак і да т. п. Да гэтых асацыяцый студэнты вернуцца на этапе азнаямлення з дэфініцыямі прыкметы і павер'я.

*Метад самастойнага канструявання пэўных паняццяў.*

Пасля чытання тэкстаў прыкмет і павер'яў, абмеркавання іх структуры і зместу, пасля работы з асацыяцыямі студэнтам прапануецца даць азначэнне паняццяў прыкмета і павер'е, г. зн. сканструяваць уласныя версіі і зафіксаваць іх у сшытку. Прадстаўленыя імі варыянты супастаўляюцца і абмяркоўваюцца. Сацыялізацыя вынікаў праведзенага студэнтамі даследавання можа здзяйсняцца наступным чынам (*прыём* называецца «*Панэль*»): выступовец мае права на выказванне толькі з адкрытага месца (напрыклад, у цэнтры аўдыторыі ці ля дошкі), пры гэтым астатнія ўдзельнікі дыскусіі выказваць свае меркаванні павінны таксама з адкрытага месца.

Такім чынам не толькі трывала фіксуецца ўвага ўсіх прысутных на прадмеце абмеркавання, але яшчэ і забяспечваюцца высокая інфармацыйнасць заняткаў і максімальная ступень разумовага і творчага самавызначэння студэнтаў.

*Метад параўнання версій.*

Пасля абмеркавання версій, сканструяваных студэнтамі, выкладчык зачытвае азначэнні (студэнты павінны зафіксаваць іх у сшытках), якія прадстаўлены ў падручніках і даведніках. На гэтым этапе ўласна сфармуляваныя азначэнні параўноўваюцца з тымі, што прапанаваны вучонымі. Робяцца пэўныя высновы.

Прапанаваныя фармулёўкі прыкмет і павер’яў, як уласныя, так і навуковыя, пажадана ўносіць у табліцу. Напрыклад:

| Прыкмета | | | Павер’е | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Уласная версія | Дапаможнік, падручнік | Адметнае | Уласная версія | Дапаможнік, падручнік | Адметнае |
| | | | | | |

Агульныя моманты варта падкрэсліваць, адметныя – вынесці ў асобны слупок (так дасягаецца добрае запамінанне матэрыялу, адбываецца пастаянны яго аналіз, забяспечваецца аб’ектыўнасць вывадаў).

Пры вывучэнні студэнтамі прыкмет і павер’яў надзвычай карыснымі з’яўляюцца кагнітыўныя заданні: скласці алгарытм адрознення прыкмет і павер’яў, рашыць навукова-даследчую задачу (напрыклад, вызначыць частату ўжывання прыкмет розных тэматычных груп) і прадставіць вынікі ў выглядзе дыяграмы або графіка, сфармуляваць азначэнне, запоўніць табліцу (гл. ніжэй) і інш). Напрыклад:

| Жанр | Тэматычны дыяпазон | Функцыянальная разнастайнасць | Сродкі мастацкай выразнасці | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| Прыкметы | | | | |
| Павер’і | | | | |

Не менш запатрабаваны і крэатыўныя заданні. Сярод іх найбольш папулярны такія, як стварэнне ўласнай тэорыі паходжання прыкмет і павер’яў, стварэнне камп’ютарных прэзентацый («Прыкметы і павер’і студэнцкага асяроддзя», «Прыкметы і павер’і як фальклорныя жанры» і інш.) і тэматычных відэаролікаў (напрыклад, «Прыкметы і павер’і ў жыцці сучаснага чалавека»), напісанне нарысаў, тэматычных сцэнарыяў радыёперадач і да т.п.

Відавочна, што большасць заданняў, прапанаваных выкладчыкам, накіравана на актывізацыю самастойнай работы студэнтаў, на развіццё іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей, на ўменне нестандартна рашаць пастаўленыя задачы. І гэта вельмі важна, таму што, як трапна заўважылі вядомыя педагогі С. У. Кульневіч і Т. П. Лакацэніна, «...любое дзеянне прызнаецца якасным толькі тады, калі за ім стаіць асобасны сэнс, унутраная складаючая, што і забяспечвае знешнюю, прызнаваемаемую іншымі якасць

гэтага дзеяння. Працэс узнікнення асобаснага сэнсу ведаў магчымы тады, калі вучань удзельнічае ў вытворчасці сваіх ведаў» [1, *6–7*].

Такім чынам, выкарыстанне інавацыйных метадаў і прыёмаў работы садзейнічае пашырэнню аб’ёму вучэбнай інфармацыі, эфектыўнасці навучання і павышэнню яго якасці, спрыяе самарэалізацыі і самаразвіццю студэнтаў, актывізацыі іх творчага патэнцыялу.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Кульневич, С. В.* Совсем необычный урок: практическое пособие / С. В. Кульневич, Т. П. Лакоценина. – Ростов-на-Дону, 2001.